Год II | Субота, 21 студня 1922 г. | № 14 (23)

РАНІЦА

штодзенная грамадзкая, палітычная і літэратурная газэта

АДРЭС РЭДАКЦЫІ і КАНТОРЫ:
Вільня, Вострабрамская № 4, „Hotel Szlachecki" пак. № 2.
Рэдакцыя адчынена што дня, апрача сьвят, ад 11 да 1 і ад 5 да 7 гадз.

Цана нумару 20 марак.

Падпіска на 1 мес. . . 400 марак.
З перасылкай 1 „ . . 500 „
За граніцай ў два разы даражэй.

ЦАНА АБВЕСТАК:
За адзін радок звычайнага друку на 1 стр.—60 м.
ў тэксьце . . . . 75 м.
за тэкстам . . . . 40 м.
Для шукаючых працы на 10 прац. таней.

Вільня, 21 Студня 1922 г.

Агульная палітыка Эўрапейскіх дзяржаў мае характэр яўнай нерашымасьці і неапрадзялёнласьці. Дзяржавы ніяк ня могуць дайсьці да паразуменьня і згоды па самым аснаўным пытаньням, пытаньням апошняга часу.

Англія, якая праканалася, што для яе ненармальныя варункі тарговлі з Германіяй прыносяць вялікую шкоду, якой не пакрывае навет кантрыбуцыя, наложаная на Германію, гатова зусім адмовіцца ад гэтай кантрыбуцыі толькі-бы хутчэй пачаць эканамічную адбудову і потым скарыстаць яе для сябе.

Угэтым напраку Лёйд-Джордж і нажымаў на астальныя дзяржавы.

Падтрыманьне ён знайшоў толькі з боку Італіі.

Што датычыцца да Бельгіі і асабіста да Францыі, дык інтарэсы гэтых дзяржаваў вымагаюць зусім іншых адносін да гэтай справы.

І калі Брыян яшчэ згаджаўся пайсьці на сустрэчу Лёйд-Джорджу ў справе тэрміну выплаты Германіей кантрыбуцыі, дык новы прэмьер Пуанкарэ катэгарычна заявіў, што Францыя ў справе заплаты кантрыбуцыі ня ўступіць Гэрманіі ні аднаго сантыма; ня зробіць адсрочкі ні на адну гадзіну.

У гэтай справе палітыка Францыі востра расходзіцца з палітыкай Англіі, Амэрыкі і Італіі.

Гэты пункт расходу не дае мажэбнасьці Францыі прыняць учасьця ў будучай канфэрэнцыі ў Генуі ў справе эканамічнай адбудовы Эўропы.

Але ёсьць яшчэ другі пункт, які так сама служыць перашкодай для агульнай палітыкі. Л.-Джордж, як ужо ведама, адтрымаўшы ультыматум ад шэсьці мільёнаў англійскіх рабочых, прэдлагаючых прызнаць савецкую ўласьць у Расеі, ня можа вясьці цьвердую, апрэдзеленную палітыку, на якую стала Францыя ў гэтым пытаньні і ад гэтага выйгрываюць бальшавікі, якія атрымаўшы запросіны на канферэнцыю у Генуі, апрацавалі, навет, праграму, згаджаючыся на звароченьне расейскіх даўгоў, Ленін трэбуе павароту гандлявых карабелёў, забраных Дзенікіным, Юдэнічам і Врангелем, павароту Усходняй Сібіры, эканамічнай адбудовы Расеі і вазабнаўленьня эканамічных зносін з заграніцчнымі дзяржавамі.

З гэтага відаць, які добры апэтыт маюць саўдэпскія людаеды.

Застаецца запытаць, ці карыст на для Эўропы палітыка кампрамісаў і згоды з фанатыкамі бальшавізму, з здяржавай, якая ужо бьецца ў прадсмертных сударгах агоніі.

Ці ня ляпей вясьці цьвердую і апрадзялённую агульную палітыку, як у адносінах да Германіі, дык і ў адносінах да Савецкай Расеі — якой саўсім ня мейсца сярод іншых дзяржаў, прымаючых учасьце ў Генуэскай канферэнцыі?

Як бы там ні было, але сагласаваць агульную палітыку трэба, бо толькі згода і ўсільле ўсіх дзяржаў могуць паправіць эканамічныя варункі жыцьця і ліквідаваць эканамічны крызыс, які з году на год пашыраецца.

✦✦✦✦

ТЭЛЕГРАМЫ.

РЫГА 20. І. (А. В.). Рэпарацыйныя пастановы паміж немцамі і Літвой засталіся парванымі. Шэф дэлегацыі ад Нямеччыны Ліндэнбург выехаў да Бэрліна.

БЭРЛІН 20. І. (А. В.) У Варшаве нямецкім пaслом ёсьць барон Рэхэнберг. Ён жа зьяўляецца ініцыатарам і заклаўчыкам польска-нямецкага таварыства да часу нямецкай акупацыі.

БУДАПЭШТ 20. І. (А. В.) Будапэшскі дзеньнік паведамляе, што ў Кардавіцах адбыўся з'езд расейскіх манархістаў, кіраўніком якога быў былы царскі міністэр Макараў. Гэты зьезд зрабіў пастанову, афяраваць расейскі трон матцы быўшага цара Мікалая, царыцы Мар'і Фёдараўне. На з'ездзе так сам прэзэсам быў мэтрапаліта Эўлогі.

ЛЬВОЎ 20. І. (А. В.) Львоўска Вечарова Газэта паведамляе, што на польска-ўкраінскай граніцы, курс польскае маркі павышаецца. Марка на граніцы каштуе 200 савецкіх рублёў. Жыхары Украіны ня хочуць прымаць савецкіх грошаў.

МАСКВА 20. І. (А. В.) Савецкая прэса робіць увагу на апошнюю інтэрвэнцыю прэмьера Пуанкарэ і заве цалы пролетар'ят да барацьбы з ворагамі камуністычнага пролетарьяту.

БРУСЭЛЬ 20. І. (А. В.). У Бэльгіі польскі пасол Собанскі бэльгіскаму кулеўству, ўручыў залатую мэдаль „Чырвонага Крыжа", як сымвал вазраджэньня Польскага народа пад заніч[ыта]й чырвонага крыжа Польскага гаспадарства.

РЭВЕЛЬ 20. І. (А. В.). Эстонскае агенства паведамляе, што 24 гэтага месяца да Варшавы едзе этонская дэлегацыя ў мэце зрабіць ўмовы на прадмэт гандлю паміж Польшчай і Эстоніяй.

Весткі з Варшавы.

ВАРШАВА 20. І. (А. В) Прыезд да Варшавы савецкага пасла Карахана спазніўся, па прычыне ўрэгіляваньня гандлёвых адносін з саветамі. Праца гандлёвая хутка павінна распачацца ў Варшаве.

Савецкае пасольства паведамляе, што Карахан прыедзе да Варшавы 22 студня.

ВАРШАВА 20. І. (А. В.) Польскі дэлегат Ашкеназе ў пятніцу зьвяртаецца да Варшавы ў справах службовых. Другі дэлегат Шэбэка ў гэты час у Жэневе будзе мець функцыі дэлегата ад Польшчы, дзеля залатвеньня спраў паміж Польшчай і Нямеччынай.

ВАРШАВА 20. І. (А. В.) У тых днях прыбывае да Варшавы эстонскі пасол Гэлянд.

ВАРШАВА 20. І. (А. В) У чацьвер адбылася дыскусія соймавай камісіі ў справах заграцічных. Тэма для дыскусьі, прадложаная п. Скірмунтам, была— агульная сытуацыя палітычнага характару ў сьвязі з Гэнуэскай канфэрэнцыяй, а так сама справа аб Віленшчыне. Пастанову па паседжаньні вынесена ня было. Аддзельная камісія рабіла выясьненьне становішча соймавых клюбаў, актуальных палітычных загадаў, а так сама і адносін ураду да тых загадаў.

ВАРШАВА 20. І. (А. В.) Рада міністраў прыняла прапазыцыю аб скасаваньні галоўнага ўраду вывазу. Гэты праэкт павінен быць разгледжаны і зацверджаны Соймам.

✦✦✦✦

КАРЭСПАДЭНЦЫІ

З Мазырскага павету.

(Ліст у рэдакцыю.)

Вы нашы браты, якія жывеце за кардонам, у шчасьлівай Польшчы, навет увабражэньнем ня можаце сабе прадставіць усю марнасьць нашага жыцьця!

Мы ня можам спакойна спаць, бо кожную ноч чакаем сваіх ворагаў — чакаем наезда чразвычайшчыкаў.

Мы ня можам прапаваць бо ўсё, што мы выпрацуем, з'ядуць гультаі камісары, адбяруць чэкісты і чырвонаармейцы.

Уся наша гаспадарка да чыста зьнішчана.

Добра яшчэ, што ў Тураўскай Пушчы ёсьць шмат партызанаў. Яны пастроілі сабе зямлянкі і зімуюць сярод лесу. Частку свайго быдла мы схавалі ў лясу. Партызаны каравуляць яго, а за гэта мы даём ім хлеба і сала.

Нядаўна ў нас было такое здарэньне! Ехаў лесам камісар ды яшчэ які камісар. Праз яго некалькі чалавек растрэлялі, а сколькі зажыва гніе ў склепах чразвычайкі і ў Мазурскай турме — нават і пералічыць ня можна.

Дык вось гэты людает-камісар ехаў на Мерлінскія хутары, каб арыштаваць аднаго гаспадара, на якога шпег даказаў што ён дапамагае паўстанцам. З камісарам была чатыры конных чырвонаармейца.

Уехалі яны ў самую гушчарню. Наперадзі скакалі ў двох і бачаць, што праз дорогу павалена велізарная саска. Застанавіліся і сталі радзіцца як быць. Трэба скідаць сасну ў бок, але сасна такая вялікая, што навет утрох ня стронуць яе з мейсца. А аб'ехаць няма як..

Камісар ужо хацеў паварнуць назад, як наскачылі з лесу людзі са стрэльбамі.

Старшы закрычаў: „рукі ўверх!" Камісар зараз жа падняў рукі, а адзін чырвонаармеец сьпебануў каня і паскакаў, але людзі пусьцілі яму ў дагонку кулю і ён скаціўся з сядла..

Праз некалькі хвіль камісар быў моцна скручаны вяроўкамі, ў чырвонаармейцаў адняли аружжа, зьнялі боты і шынелі і прыкладамі загналі іх у гушчыну...

Камісара прывязалі ў станявішча атамана Бабра і там ён скончыў свае подлае жыцьцё ў страшэнных муках...

Як толькі прапаў камісар з Мозыра прыехаў карацельны атрад. Шукалі ўсюды дапытываліся, хто і дзе яго бачыў. Пачаліся рэпрэсіі, некалькіх гаспадароў арыштавалі, разграбілі іх гаспадарку і адправілі зьбітых у Мазырскую чразвычайку, дзе праз два тыдні зьдекаваліся над імі, а потым расстрэлялі.

Пра Мерлінскія хутары пашлі страшэнныя чуткі. Казалі што ўсе бальшавікі, ехаўшыя туды за якім інтэрэсам, адтуль ужо не звароч[в]аліся..

І цяпер карацельныя атрады баяцца Туранскай пушчы як агню... Ні якія наказы не заставяць іх ісьці ў гушчарню лесу, дзе іх чакае верная сьмерць і нечалавечыя мукі.

Атаман Бабр, які з сваім атрадам зялянадубцаў сядзіць у пушчы, даў клятву не астаўляць у жывых ні воднага камуніста, ні воднага камісара.

Сяляне паважаюць старага Бабра і даюць яму і яго сябрам дапамогу і прытулак. Бобр чалавек адважны. Ен не адзін раз бываў у самым Мозыру, хадзіў з торбай, як запраўдны пабірака, выглядаў, што яму патрэбна і зварочаўся ў свой родны лес, у Туранскую пушчу.

Бачылі Бабра і за Слуцкам, у Качай Балоце. Яго ўсюды ведаюць і сустрэчаюць як роднага героя, які гатоў ў кожны момант аддаць сваё жыцьцё за родную зямельку.

З. Д.

✦✦✦✦

Навіны у тры радкі.

Усходняя палова Амурскага вокруга з'ўляецца арэнай моцных баёў.

Чырвоная армія атакуе станцыі Амурскай зялезнай дарогі.

Зялезнадарожныя служачыя у Германіі пагражаюць забастоўкай, калі ім не дадуць новай прыбаўкі да пэнсіі.

У Саўдэпіі з 1922 года устаноўлены новыя падаткі, за прапіску відаў на на права жыцьця ў Маскве 5000 руб., за выяўку 5000 руб., з занятых памешканяў узымаецца 3000 руб. за кв. арш., за спраўку адрэснага стала 5000 руб., 10 проц. коштy білета.

У памяшканьні Харкаўскай чразвычайкі зрабіўся пажар, зьніштожыўшы частку памяшканьня і архіў. У горадзе ходзяць чуткі, што чразвычайку падпалілі самі чразвычайцы, каб скрыць сляды сваіх праступленьняў.

З Бэрліна паведамляюць, што у парламент внесены праэкт зьнішчэньня прырэйнскіх крэпасьцяў—Кельна, Кобленцах Майнца і Гермерзгейма.

З Гельсынфорсу паведамляюць, што ў апошні час сытуацыя карэльскіх паўстанцаў палепшала. Усе чуткі аб ліквідацыі паўстаньня, пашыраемыя бальшавікамі, няверныя.

З Коўны паведамляюць, што там павя дарагоўля. За фунт чорнага хлеба плацяць ім 50 ф., хлеб пшанічны каштуе 6 к., 1 ф. сала 18 мар., яйко 4 мар.

ХРОНІКА.

Гадаўшчына службы генэрала С. Макржэцкага

18 студня ў вечары ў памяшканьні б. прэзыдыума часовай Урадавай Камісыі састаялася парадная вячэра, па выпадку гадаўшчыны службы генэрала С. Макржэцкага, на мейсцы ісполняючага абавязкі прэзэса Часовай Урадавай Камісыі. Прысутнымі былі служачыя канцэлярыі прэзыдыума прыс. пав. Кулікоўскі і Медзянаўскі, б. прэзэс часов. Урадовай Камісыі п. Абрамовіч і інш. служачыя. Вячэра скончылася каля 1 часа ўначы.

Новы гербавы збор.

Сёньня чакаюць апублікаваньня новага гэрбовага статута, які будзе мець сілу на ўсей тэрыторыі Сярэдняй Літвы.

Акцыз на спірытус.

З 31 студня акцыз на спірытус будзе павышаны.

Прападаюць людзі.

19 студня ў паліцыю паступіла заява ад Вацлава Захарьяшэвіча (Арсэнальная 4 кв. 5) аб тым, што служачая ў яго дзяўчына Галена Варэйко, 16 гадоў, выйшла на раніцы 15 гэтага студня з хаты і назад не зьвярнулася. Прапаўшая—брунэтка, валасы кароткія.

Цікавая рэч,—што за апошнія тры тыдні гэта ужо амаль не дванадцаты выпадак прапажы людзей. Сярод прапаўшых знаходзяцца мужчыны меўшая пры сабе грошы і маладыя кабеты, не меўшыя пры сабе грошаў.

Мейсцовая паліцыя вельмі зацікавілася гэтай справай і вядзе інтэнсыўнае шуканьне віноўных.

Пакуль што ўсе шуканьня прапаўшых асоб не далі рэзультату.

✦✦✦✦

Тыпы Палесься.

(маленькія абразкі).

3. Гандляры.

Гоніць вецяр хмары па небу, сярдзіта грухаціць дождж па ствалох і лістох дубоў-плача непагода. У хаце цёмна. Смалякі даўна ўжо пагарэлі, але класьці другія ня хоча рыжы Дзядзёнак, а мо забыўся, альбо мары занясьлі яго далёка... Ці яму цяперака да агню? Чырвоны водбляск згасаючых вуглёў ледзьве асьвячаў вялікую галаву, пакрытую рыжымі валасамі, атсьвечываўся ў вострых вачох Дзядзёнка...

Прыёмныя мары былі ў яго...

Вось ён малады, моцны як дуб. З ім яго дзед Ярэм, сівы як лунь, але моцны дзед!

Пры ўспамінаньні аб ім уздыхае цяжка Дзядзёнак, пасьля моцна сьціснуў ўшы кулакі ён успамінае далей...

Вось, вось, ночка... Прыемна сьвеце з высокага неба месячык, сьнег хрусьціць пад нагамі яго і дзеда Ярэма... Вось яны крадуцца да карчмы, ля якой стаіць тройка канёў і багатыя сані з мядзьвежай скурай. Смачна ядуць коні канюшыну, нясецца з карчмы песьня, плача гармоніка. Моцна калоціцца сэрца ў яго. Вось яшчэ міг, яны з дзедам каля коняў, хвіля—дзед падбірае лейцы, а ён з ружжом садзіцца ў сані і зорка глядзіць на дзьверы карчмы. Усё гатова. Коні крануліся, і ў той міг раздаўся стрэл і моцны крык „стой“!

Як нажом разрэзаў цімніну ночы. Але дзе там! Дзед гвізнуў, і тройка панеслася...

Бах, бах, бах—грымяць ім у сьлед стрэлы. Сьвішчуць кулі над галавой...

Ці да стрэлаў, ці да куль!

Коні ня бягуць, а ляцяць здаецца і толькі пыль ад сьнегу рэжа вочы.

Божа! Што гэта! Што гэта! Ці мнее ў вачох Дзядзёнка, чаму дзед схіліўся ў сані і нешта шапоча яму маладому...

Схіліўся да яго ён, крыкнуў: „Дзедка, а дзедка, што табе“?

Яшчэ мацней рванулі коні, ад крыку яго яшчэ хутчэй панясьліся...

— „Дзедка родны, што табе“?

— „Памятай завет ні ні...“ шапоча дзед і падае няжывы...

— „Добра, дзедка добра!.. шапоча Дзядзёнак пабялеўшымі губамі, „памятаць буду, памятаць буду“...

Праходзяць годы. Шмат трояк зьвёз Дзядзёнак, шмат душ ляжыць на яго сумленьні, але гэтага мала. Здаецца яму, што дзеда душа жадае ад яго большай помсты! „Добра дзедка, добра“! Гавара сам з сабой Дзядзёнак.

Плача за вакном няпагода.

„Пара“! Сказаў ён глухім голасам, і сам спужаўся свайго голасу.

Заварушыўся Пётра на печы ад воклiку Дзядзёнка...

„Га, чаго“?

„Пара“! Сказаў Дзядзёнак і палажыў смаляка на вугольлі. Загарэўся смаляк, асьвяціў хату.

Зьлез з печы Пётра. Хутка апрануўся. „Ну“? пытаючы глянуў на Дзядзёнка. Тай на яго. „Едзем“! Скамандаваў Дзядзёнак.

„Куды“? Задаў пытаньне Пётра.

„Дастанавога на варaных“, адказаў Дзядзёнак. „Гай да“! Вясёла падморгнуў Пётра.

Выйшлі з хаты. Сярдзіта сустрэла іх няпагода. Хлестануў дождж ім у вочы...

Праз хвілю два цёмных коніка, як нейкія страшэнныя цені нясьліся праз лес...

„Добра, дзедка, добра“! Шапоча Дзядзёнак.

„Споўню завет!...“

Нясуцца па небу цёмныя хмары. Сярдзіта дождж грухаціць па лісьцёх і ствалох дубоў...

Плача няпагода...

Ганчар.

Доўга глядзеў Ганчар на Каршуна, які ганяўся за нейкай птушкай, нарэшце ня вытрымаў, прылажыўся і выстраліў са славамі:

„Вось табе разбойнік!“

Ад неспадзеўкі каршун узьвіўся раней ўверх, але мусіць яго зачапіла добра шротам, бо ён пачаўшы робіць выкрунтасы, ўпаў на зямлю. А збаўленая ад сьмерці птушка пісьнула і паляцела хутчэй да лесу.

„Ляці!“ Ласкава сказаў ён ёй ў сьлед, закладаючы стрэльбу за плечы. „Добры даянёк будзе“, пачаў Ганчар. Вось люблю гэткія дні, калі на небе ні воднага воблачка ня ўгледзіш, а бачыш толькі адно неба, шырокае, як мара...

Я паглядзеў на яго. Той зараз зірнуў на мяне, і ўсьмяхнуўшыся сказаў:

„Я ведаю, чаго вы зірнулі на мяне, бо ў вас з'явілася патэньне, чы бачыў я калі мора? Гэта праўда вы падумалі-я мора ня бачыў“... казаў ён, цяжка ўздыхнуўшы.

„Ну але мары аб ім у мяне бываюць. Гэтак вось іншы раз глядзіш на траву на нашым вялікім балоці, альбо на сітняг, дык меркуеш, ці ня так сама па ім ходзюць хвалі, толькі ведама вялікія... Па траве альбо сітнягу так сама ходзюць хвалі, калі вея ветрык.

„Ведаеце што—казаў ён далей“. Я нічога ў жыцьці ня кахаю так моцна, шчыра, як кахаю лес... Гляньце на яго ў дзень у вечара, раніцай, ў начы, ў ваўсякі час ён мае сваю пекнату, будзь гэта ў добры дзень, ці ў буру. Заўсёды лес цягне мяне да сябе. З далёку вось чуеш як шуміць ён і здаецца шапоча, мяне заве...

А як добра ў жаркі дзень разлягчыся дзе-кольвек на траўцы пад дубком, ня агледзішся, як заснеш пад ціхі гоман лісьцяў...

Прасьнешся, адкрыеш вочы: наўкола стаяць сосны, ёлкі, дубы, бяроскі; з галін насуцца песьні птушак, і здаецца, што ты папаў ў рай, аб якім пішуць у сьвятых кніжках. А як прыемна ўчуць у лесе звон у вечары! Ен плыве з званіцы, ўваходзіць у душу, маніць да сябе, кліча зьвярнуцца да Бога. Увесь лес здаецца прыціхае, ні шуму лістоў, ні песьняў птушак, толькі ён, ён папаўняе лес вячэрні звон...

Променьня апошнія сонца іграюць яскрава на залітым далёкім крыжу царквы ў сяле... Хутка ночка настане, хутка зоркі замігаюць на небі. Будзе спаць поле, будуць спаць людзі, будзе спаць і лес, пад цудоўны шопат начы...

„Не, не ніколі я не здраджу лесу, ніколі“! Горача закончыў Ганчар і мы ўвайшлі ў лес.

— „Вось ён“! Зьняўшы шапку сказаў Ганчар.

„Я ўваходжу ў яго як бы ў сьвятыню Бога. Ці чуеце, як шапоча ён? Аб чым“?

— „Чую“! Ціха адказаў я, і так сама зьняў шапку. Лес шумеў.

Дзяргач.

✦✦✦✦

Стэнаграма З'езду Заходняй Беларусі.

(Глядзі з 1 да 19 № „Раніца“.)

Есьць у рэзалюцыі адзін пункт, дзе сказана, што мы жадаем, каб такія то вучыцялі, называеце іх фаміліі, былі назначаны на пасады. Грамадзяне, рэзалюцыя павінна насіць характар агульны і прынцыповы, што да нашага жаданьня мець беларускія школы і ўстаўляць у такую рэзалюцыю прозьвішчы вучыцялёў —не выпадае.

Затым, што да прыватных школ.

Асьветны Аддзел пры Камітэце Краёвай Сувязі выдае пасьведчаньні вучыцелём, з якім лічацца Улады і дапамаем гэтым школам падручнікамі і прыладамі. Школы разьвіваюцца і скора будуць перавядзяны на ўрадовыя.

Вось усё, што магчыма зрабіць і што робіцца ў гэты час.

Рэзолюцыя ставіцца на галасаваньне і прыймаецца.

Сенкевіч: Беларускую зямлю можна паддзеліць на тры эканамічныя раёны: Першы—гэта землі, што ляжаць ля ракі Нёмана; другі—Навагрудчына і Сярэдняя Літва і трэйці—Палесьсе. Эканамічнае жыцьцё першай часьці стаяло заўсёды на першым мейсцы — цэнтрам быў Белысток. Пасьля ідзе Сярэдняя Літва, Вільня і Навагрудак, якія з'яўляюцца так сама асяродкам эканамічнага жыцьця. Палескае ваеводства, дзякуючы свайму гэаграфічнаму становішчу, з эканамічнага боку—занедбана. Наагул, стастановішча беларускага эканамічнага жыцьця, ў гэты момант, вельмі цяжкае. Былі, дзеля гэтага, рожныя прычыны. Першая — гэта палітычная; народ наш трымалі у цемры, уселякія пачаткі і прэдпрыемствы душылі. Польскія паны, якія культурна стаялі вышэй нас—стараліся, што магчыма, забраць у свае рукі. Мы—беларусы, аказаліся інэртнымі. Гэтык было да рэвалюцыі 1917 году...

Старшыня: я бы прапанаваў в значыць для прамоўцы акрэсьлены час на яго прамову.

Сенкевіч: Я буду гаварыць канкрэтна. Я скажу толькі аб каапэрацыі, бо гэтая справа найшырэй абхоплівае народныя масы. Каапэратыўны рух на Беларусі пачаўся толькі з 1917 г. Усім нам ведама, якое вялікае значаньне мае Саюз каапэратываў...

Старшыня: Есьць прапанова паслаць на польскую канфэрэнцыю „Одродзэне“ дэлегатаў ад нашага з'езду з прывітаньнем.

——

Прапанова прыймаецца і пасылаюцца 4 дэлегаты: Пупка, Каспэровіч, Маркевіч і Дутлоўскі.

——

Сенкевіч: Я хачу сказаць яшчэ пару слоў аб складніцы і каапэратыве „Самапомач“, які з'арганізаваў камітэт Краёвай Сувязі. Адзелы гэтага каапэратыву, за апошні час пашыраны на правінцыі і што раз, та ўсё абнімаюць новыя і новыя пляцоўкі. Калі на гэтым шляху ня сустрэнецца важных перашкод, дык можна спадзявацца пажаданых рэзультатаў і падняцьця, наагул, эканамічнай справы нашага краю.

Цяперака дазвольце мне прачытаць рэзалюцыю эканамічнай камісіі. (Чытае).

1. Прызваць Польскі Урад, каб не рабіў згубнае гаспадаркі ў Белавежскіх лясох, а вёў яе рацыянальна.

2. З'езд стаіць на грунце, як можна шырэйшага пашырэньня руху эканамічнага на Беларусі, каторая знаходзіцца ў граніцах Рэчы-паспалітай Польскай З'езд з'вяртаецца да Польскага Ураду аб выдачы строгага прыказу мейсцевым Уладам Польскім, каб у руху эканамічным Беларускім не рабілі ніякіх перашкод.

3. Бачучы на тое, што каапэратывы на Беларусі абслужываюць найшырэйшыя слаі грамадзянства Беларускага, з'езд зьвяртяецца да Польскага Ураду з тым, каб апошні удзяліў крэдыты дзеля Беларускіх Каапэратываў,

4. З'езд просіць Польскі Урад даць як найшырэйшую помач матэрыяльную уцекачам Беларусам і каб у склад тых арганізацыяў, каторыя будуць нясьці помач уваходзілі прадстаўнікі ад Беларускага народу.

Старшыня: Цяперака прашу запісацца, хто хоча сказаць за і проці рэзалюцыі.

(Далей будзе).

✦✦✦✦

Абвестка.

Згублена

20 сьнежня 1921 году засьведчэньне на імя паручніка Гузнея Якуба, выданае праз Dowództwo Obozu internowanych w Dorohusku za Nr. 100 od 18 maja 1921 roku.

Знайшоўшага прашу вярнуць у Рэдакцыю.

Рэдактар-Выдавец: Вацлаў Адамовіч

Друкарня „Друк“ Субач 2.